# ЛИТЕРАТУРОВЕДЧЕСКИЕ И ЛИНГВИСТИЧЕСКИЕ ПОДХОДЫ К ИНТЕРПРЕТАЦИИ ТЕКСТА

**І. А. Бурдзялёва** (Мінск)

## РЫСЫ ПІКАРЭСКІ Ў «АВАНТУРАХ МАЙГО ЖЫЦЦЯ» САЛАМЕІ ПІЛЬШТЫНОВАЙ-РУСЕЦКАЙ

В статье анализируется жанровый синтетизм произведения и исследуются характерные черты, генетически восходящие к пикареске – одной из ранних жанровых форм европейского романа. В первую очередь они прослеживаются в типологии героини, С. Пильштыновой, образ которой можно назвать отечественной модификацией пикаро. Вместе с тем отмечаются и особенности, которые отличают ее от «канонического» образа плута. Также обращается внимание на схожесть с повествовательными структурами, сюжетно-композиционными элементами, характерными роману-пикареске.

Кніга ўспамінаў Саламеі Рэгіны Пільштыновай з дому Русецкіх была напісана ў Стамбуле ў 1760 г. і мела па-барочнаму доўгую і квяцістую назву: «Пададзенае свету рэха перыпетый падарожжа і жыцця майго авантураў на чэсць і хвалу Пану Богу, у Святой Троіцы Адзінаму, і самой святой Маці Хрыста, пана майго, і ўсім святым». Яна стваралася аўтаркай у першую чаргу як своеасаблівая споведзь і самаапраўданне перад блізкімі людзьмі. У аўтарскім звароце да чытача Пільштынова піша, што «ўжо з Польшчай назаўсёды развіталася і тут, у Турцыі, жыць вырашыла», а ўзялася за пяро «хіба што дзеля таго, каб іншыя, якія ведалі мяне, не дакаралі, што я, полька, маючы мужа і дзяцей у Польшчы, усе мае тыя часовыя пацехі пакінула, а сама адна ў чужы край без усялякае дапамогі і пацехі выправілася, каб жыць і памерці ў Бозе ў тым краі». Саламея называе адну з прычын свайго добраахвотнага выгнанніцтва: «Крыўды, пагарды ад мужоў, дзяцей, і блізкіх, і лёкаяў маіх – яны выгналі мяне з Айчыны маёй, дык мілей мне жыць тут, у гэтай пустэльні, у спакоі, у ласцы Божай, чым у Польшчы» [1, с. 19]. Але не толькі названыя сямейныя праблемы падштурхнулі Пільштынову да напісання мемуараў: яе жыццё настолькі насычана незвычайнымі прыгодамі, напоўнена яркімі ўражаннямі, што, безумоўна, аўтарцы хацелася спарадкаваць успаміны, больш глыбока асэнсаваць пройдзены шлях і падагульніць свае назіранні. Саламея разумела каштоўнасць назапашанага жыццёвага вопыту, важнасць пабачанага і перажытага, таму яна разлічвала на больш шырокае кола чытачоў, чым яе родныя і знаёмыя. Як адзначае А. І. Мальдзіс, «у адрозненне ад іншых мемуарыстаў Беларусі (асабліва XVII стагоддзя) свае ўспаміны Пільштынова прызначала ўжо не дзецям і ўнукам, не для “хатняга чытання”, а для друку» [2, с. 41]. Разам з тым «Авантуры» – гэта сапраўдная споведзь-правакацыя, бо многае ў аповедзе трымаецца на парадоксах, кантрастах, разбурэнні агульнапрынятых маральна-этычных норм і стэрэатыпаў.

Асоба Саламеі Пільштыновай-Русецкай сапраўды выключная для свайго часу. Паўсюль яна называе сябе полькай, але гэта слова на той час азначала палітонім, грамадзянскую прыналежнасць да Рэчы Паспалітай, куды састаў-

ной часткай уваходзіла Вялікае Княства Літоўскае. Яна нарадзілася на беларускіх землях, у наваградскім ваяводстве, адкуль у чатырнаццацігадовым узросце была выдана замуж за лекара Якуба Гальпіра, і неўзабаве выехала з ім у Стамбул. Там кемлівая маладая жанчына пераняла лекарскае майстэрства мужа, палонны доктар-мальтыец навучыў яе пісаць на латыні рэцэпты і падараваў некалькі медыцынскіх даведнікаў. Саламея хутка набіралася вопыту, інтуіцыя і смеласць спрыялі таму, што яна становіцца ў Стамбуле вельмі папулярнай як доктарка і акулістка. Калі склалася так, што яна засталася ўдавой з маленькай дачушкай на руках, лекарскія веды і ўмельства даюць ёй магчымасць весці самастойнае незалежнае жыццё.

Пошукі новых уражанняў, няўрымслівы характар былі прычынай частых пераездаў Саламеі. У выніку мемуары насычаны шматлікімі тапонімамі, якія дазваляюць вызначыць пакручастую траекторыю яе бясконцых вандровак: Стамбул, Рушчук, Хоцін, Сафія, Бухарэст, Ясы, іншыя гарады Асманскай імперыі. Калі пад Азовам у рускі палон трапілі знаёмыя туркі, яна вырашае ехаць у Пецярбург, каб паспрыяць іх вызваленню. У расійскай сталіцы Пільштынова, дзякуючы свайму лекарскаму таленту і вынаходлівасці, карыстаецца пашанай і сімпатыяй імператрыцы, выпрошвае чатырох паважаных турак з палону і вяртаецца ў Літву. Адтуль яна пускаецца ў доўгае падарожжа па Прусіі і Аўстрыі. Пасля вяртання на радзіму вядзе вандроўны лад жыцця, некалькі разоў наведвае Турцыю і, урэшце, вырашае ніколі больш не вяртацца ў Рэч Паспалітую.

Магчыма, у далёкія паездкі яе гнала і неўладкаванасць сямейнага жыцця. Другі раз яны выходзіць замуж за аўстрыйскага афіцэра, Юзафа Пільштына, якога выкупіла з турэцкага палону. Шлюб быў няўдалым ва ўсіх адносінах. Аднойчы муж паспрабаваў атруціць Саламею, і толькі цудам яна засталася жыва. Пасля таго яна вырашае жыць з мужам «у сепарацыі» і прымае заляцанні новага «амарата», які адказаў ёй чорнай няўдзячнасцю. З дзецьмі ў яе таксама не складаліся цеплыя адносіны – надта часта яна пакідала іх пад апекай чужых людзей. Не дзіва, што пад канец, пасля ўсіх мітрэнгаў жыцця, яна адчувае душэўную спустошанасць і расчараванне. Усё гэта яна шчыра распавядае ў сваёй кнізе, якую вырашыла напісаць перад падарожжам у Ерусалім. Ці вярнулася яна з паломніцтва ў Святую зямлю – нам невядома.

Успаміны Саламеі Пільштыновай пісаліся ў той час, калі ў мемуарыстыцы назіраліся кардынальныя перамены. Па-першае, па меры росту самаўсведамлення асобы і каштоўнасці індывідуальнага вопыту павялічваецца колькасць мемуарных твораў. Па-другое, як адзначае А. Мальдзіс, з цягам часу «“Дакументальная проза” рабілася ўсё больш суб’ектыўнай, мастацкай… Выразна намячаюцца новыя тэндэнцыі: дыярыушы ўступаюць месца ўспамінам, голы пералік падзей – іх суб’ектыўнаму асэнсаванню. Сціраюцца адрозненні паміж асобнымі жанравымі разнавіднасцямі, назіраецца іх сінтэз, узаемапранікненне. Мемуарыстыка ўсё больш белетрызуецца» [2, с. 26–27]. Варта нагадаць, што ўзмацненне цікавасці да асобнага, прыватнага чалавека дало штуршок і да развіцця ў еўрапейскай літаратуры раманнага жанру. Невыпадкова першыя ўзоры рамана новага часу нярэдка

былі стылізаваны пад вусны аповед і мелі назву «Запіскі…», «Успаміны…», «Гісторыя…», «Жыццё…». Нарацыя ў іх вялася ад першай асобы, у адрозненне ад рыцарскага, прэцыёзнага або пастаральнага рамана.

Канкрэтызуючы жанравую адметнасць твора Саламеі Пільштыновай, даследчыкі называюць яго раманам. Менавіта так ацаніў яе ўспаміны расійскі даследчык польскай літаратуры А. В. Ліпатаў: «Описание событий, фактов, разного рода явлений не заслоняют здесь – в отличие от большинства других известных мемуаров – образ и личность автора – его переживания, мысли и намерения, наконец, личную драму. Тем самым… стирается грань между регистрацией фактов, событий, случаев и случайностей из жизни и воспроизведением судьбы человеческой, где эти факты, события, случаи и случайности – фон, контекст, причина жизненных перипетий и духовной драмы личности. В этом манера изложения Русецкой-Пильштыновой сближается с художественным типом воспроизведения, свойственным роману» [3, с. 228]. А. І. Мальдзіс выказаўся больш дыферэнцавана: «Па сутнасці, “Рэха” – гэта раман-аўтабіяграфія, раман прыгод, дзе свабодная, “стыхійная” плынь апавядання перапыняецца ўстаўнымі навеламі» [2, с. 14].

У жанравых адносінах твор Пільштыновай складаны і шматслойны, яго сапраўды можна вызначыць і як раман-аўтабіяграфію, і як авантурна-прыгодніцкі раман, і як раман дарогі, калі карыстацца сучаснай жанравай класіфікацыяй. Спецыфічныя прыёмы названых жанраў тут спалучаюцца ў адно мастацкае цэлае. Але генетычна яны ўзыходзяць да рамана-пікарэскі – аднаго з першых жанравых варыянтаў рамана, які ўзнік у іспанскай літаратуры так званага залатога веку і вельмі паўплываў на станаўленне ўсяго еўрапейскага рамана.

Першым узорам пікарэскі, або круцельскага рамана, называюць ананімную аповесць «Ласарыльё з Тэрмеса» (1554), якая сталася асновай для мноства варыяцый жанру. Але само слова *пікара* ўпершыню з'явілася ў рамане Матэо Алемана «Гусман дэ Алфарачэ» (першая частка – 1599, другая – 1604), які ўжо ў барочнай эстэтыцы працягнуў вопыт «Ласарыльё». Для твораў гэтага жанру характэрны спецыфічны герой-пікара – махляр, прайдоха і круцель, паходжаннем, як правіла, з нізоў грамадства, якому трэба нейкім чынам выжыць у жорсткім свеце. Таму яго першасная задача – змагацца за жыццё і не памерці з голаду, а потым – дасягненне багацця і сацыяльнай стабільнасці любым спосабам, у тым ліку інтрыганствам, хітрасцю і падманам. Змест рамана-пікарэскі складаецца з ланцужка прыгод і авантур героя, пра якія нібыта ён распавядае сам у вуснай форме, або ў выглядзе запісак ці ўспамінаў. Такому тыпу героя пікарэскі генетычна папярэднічалі вобразы слуг-прайдохаў у камедыях Менандра і Плаўта, героі шванкаў, фабліа, фацэцый у сярэдневяковай літаратуры, персанажы Дж. Бакачыа і Ф. Рабле. Як жанравы варыянт пікарэска пераважна існавала ў іспанскай літаратуры, дзе яе росквіт завяршаецца ў XVII стагоддзі, але мастацкі досвед і жанравыя навацыі круцельскага рамана актыўна выкарыстоўваліся ўсімі еўрапейскімі літаратурамі. У першую чаргу гэта тычыцца героя-пікара, які перайшоў нацыянальныя і храналагічныя межы і ў розных

мадыфікацыях пачынае вандроўку па творах аўтараў розных краін. Апрача таго, як адзначае даследчыца гэтага жанру С. Піскунова, «сюжетно-композиционная схема плутовского романа, в особенности повествование от первого лица, будут использованны и в очень далеких от пикарески разновидностях романа» [4]. Элементы пікарэскі прысутнічаюць у раманах Т. Нэша, Ш. Сарэля, П. Скарона, Х. Я. К. Грымельсхаўзена, яны актыўна выкарыстоўваліся пісьменнікамі наступнай эпохі – Філдзінгам, Смолетам, Дэфо, Тэкерэем, Дзікенсам, Лесажам, Прэво, Дзідро. У беларускай літаратуры рысы пікарэскнага героя найбольш праяўлены ў творах У. Караткевіча. У XIX стагоддзі пікарэскны раман становіцца асноўнай крыніцай авантурна-бытавога і прыгодніцкага рамана. Варта таксама адзначыць, што пікарэска істотна ўзмацніла традыцыі бытавога рэалізму ў літаратуры.

Што ў творы Саламеі Пільштыновай родніць яго з пікарэскным раманам і ці знаёма яна была з узорамі падобнага роду літаратуры? Заходнееўрапейскі раман трапляў на тэрыторыю Рэчы Паспалітай пераважна праз пераклады ці праз пасрэдніцтва французскай мовы. Вядома, што «Гусман дэ Альфарачэ» М. Алемана быў надрукаваны на латыні ў Гданьску яшчэ ў 1652 годзе. У XVI стагоддзі на польскую мову была перакладзена з нямецкага кніга пра прыгоды Ціля Уленшпігеля, у польскім перакладзе Савізжала (Sowizdrzał/Sowiźrzał). Да XVIII стагоддзя гэта кніга пра вясёлыя і забаўныя авантуры героя-круцяля мела 12 перавыданняў і карысталася папулярнасцю. Саламея Пільштынова не магла пахваліцца вялікай вучонасцю, але гэта акалічнасць спрычынілася і да лепшага, бо яе тэкст пазбаўлены груваcткіх рытарычных канструкцый, характэрных для твораў сармацкага барока. Хутчэй за ўсё яна мела звычайную хатнюю адукацыю, што абумовіла жывы і непасрэдны, амаль размоўны, стыль яе мемуараў. На старонках яе твора няма ані згадкі пра кола яе чытанняў, ды і наўрад ці яна мела на гэта час і жаданне. З іншага боку, Саламея даволі доўгі час жыла пры двары рускай імператрыцы, круцілася ў аўстрыйскіх прыдворных колах, шмат бачыла і чула, была цікаўнай, мела гнуткі розум і фенаменальную памяць. Нельга цалкам адмаўляць апасродкаваны ўплыў вядучых літаратурных павеваў на паэтыку мемуарнага твора Пільштыновай. А. В. Ліпатаў слушна адзначае, што тэндэнцыі, якія на той час былі вядучымі ў тагачасным еўрапейскім рамане, прама ці апасродкавана, часам неўсвядомленыя мемуарыстамі, уплывалі і на напісанне разнастайных мемуарных твораў [3, с. 219]

Асноўная рыса, якая збліжае «Авантуры майго жыцця» з круцельскім раманам – гэта сам тыпаж гераіні мемуараў, Саламеі Пільштыновай з Русецкіх. Можна назваць постаць Саламеі айчыннай мадыфікацыяй вобраза пікара. Сама гісторыя, рэчаіснасць, асабліва ў яе пераломных, драматычных момантах, нараджае падобныя тыпы характараў, што з'яўляецца зарукай запатрабаванасці і ўстойлівасці вобраза пікара ў літаратуры. Па сутнасці, гэта вобраз-архетып, які ў розных варыянтах прысутнічаў і будзе прысутнічаць у мастацкай літаратуры. Даследчыкі неаднаразова падкрэслівалі, што герой-пікара – гэта параджэнне тагачаснай рэчаіснасці Іспаніі, якая ўступала ў новую эпоху. Саламея Пільштынова – таксама вынік свайго неспакойнага

часу, у якім ёй, самотнай жанчыне, трэба было выжываць. Невыпадкова А. І. Мальдзіс, аналізуючы мемуарныя творы барока, адзначаў іх набліжэнне да прыгодніцкага жанру, таму што сама рэальнасць, напоўненая войнамі, рэлігійнай варожасцю, шляхецкай анархіяй давала багаты матэрыял: «Само жыццё здавалася суцэльнай пасмай нечаканых прыгод» [2, с. 30].

Безумоўнай навацыяй пікарэскі быў паказ асабістай гісторыі звычайнага чалавека, які застаецца сам-насам з жыццёвымі выпрабаваннямі. Гэта ўжо быў герой з асабістым лёсам, а не пазбаўлены індывідуальных якасцей прадстаўнік пэўнай грамадзянскай супольнасці. Тым не менш у рэнесанснай і ў вялікай ступені барочнай пікарэсцы акцэнт больш прыпадаў на знешні, падзейны бок, паказ «унутранага жыцця» героя заставаўся па-за сферай мастацкага адлюстравання. Мемуары Пільштыновай адрозніваюцца наяўнасцю псіхалагічнага пачатку, фіксацыяй перажыванняў і эмоцый, што яшчэ больш падкрэслівае індывідуальнасць гераіні і ўнікальнасць яе асабістага лёсу. Сярод адметных момантаў таксама варта назваць адсутнасць іроніі і сацыяльнай сатыры, якімі быў афарбаваны аповед «кананічнага» пікара. У творы Саламеі хутчэй раскрываецца яе душэўная драма, часам роспач і адчай чалавека перад сілай абставін.

Як адзначалася, у класічных узорах гэтага жанру пікара паходзіць з грамадскіх нізоў або з дэкласаванага дваранства, але апрача таго, аказваецца яшчэ і «выкінутым» са свайго прывычнага сацыяльнага асяродку. Ён існуе нібыта па-за прывычным падзелам соцыуму на класы, пласты, супольнасці. Саламея таксама «бязродная шляхцянка», якая ў маладым узросце апынулася па-за радзімай, зразумелай і блізкай ёй культурай і верай, у чужой краіне без усялякай падтрымкі. Жыццё прымушае яе быць прагматычнай і меркантыльнай, як і герояў пікарэскі. Яна заўсёды добра памятае, якую плату ўзяла з пацыентаў, колькі сама за што заплаціла, кошты пакупак. У вандроўках яна абавязкова звяртае ўвагу на матэрыяльныя рэчы – тканіны, вопратку, мэблю, упрыгожанні, на тое, што з’яўляецца вонкавай прэзентацыяй багацця і дабрабыту. Апрача лекарскай практыкі, прадпрымальная і ініцыятыўная гераіня будзе гандляваць палоннымі, купляць і прадаваць тканіны, дарагія слуцкія паясы. Зарукай выжывання для яе з’яўляюцца не толькі розум, смеласць, кемлівасць, але і хітрасць, падман, рознага роду круцельствы, уменне маніпуляваць людзьмі. У пэўнай ступені гэтыя хітрасці і махлярствы падаюцца апраўданымі і неабходнымі, нават следствам разумнай ініцыятыўнасці.

Жыццёвыя абставіны прымушаюць яе быць упартай і настойлівай, хітраваць і рабіць не вельмі прыгожыя ўчынкі, але ўсё ж такі яе нельга назваць сапраўднай махляркай, класічнай гераіняй-пікарэсай. Махлярскі пачатак у характары гераіні не такі выразны і не вызначае яе жыццёвую пазіцыю. Саламея не прыроджаная прайдоха: такой вымушае яе быць рэчаіснасць, законы выжывання. Яна стараецца дзейнічаць згодна з хрысціянскімі запаведзямі, але ў пэўных сітуацыях пры дасягненні жаданага яны далёка не заўседы выступаюць для Саламеі ў якасці непарушных маральна-этычных прынцыпаў. Пільштынова шчыра апісвае ўсе перыпетыі ўласнага лёсу, не хаваючы і тых эпізодаў, дзе паўстае не ў лепшым абліччы.

Даследчыкі невыпадкова называюць пікарэску антыраманам, а пікара антыгероем, бо апісаныя махлярскія прыгоды супярэчаць нарматыўным паводзінам. Паказальна, што Г. Гачаў вызначыў пікарэскны раман як «анты-жыцце». Некаторыя польскія літаратуразнаўцы пачатку мінулага стагоддзя ўбачылі ў Саламеі Пільштыновай папярэдніцу «дэфармаваных эмансіпатак», «аперэткавую авантурніцу», якая пагналася за «фартунай, славай лекарскай і шчасцем па ўсім свеце». Натуральна, што постаць Пільштыновай выклікала такую адзнаку яшчэ і праз неадпаведнасць стэрэатыпным поглядам на «правільныя» паводзіны, месца і сацыяльную ролю жанчыны. Толькі пазней Зыгмунт Куховіч убачыў у яе творы «новую мадэль жаночага шчасця». Нягледзячы на тое, што пікара – антыгерой, апрача асуджэння і здзіўлення, ён выклікаў нязменную цікавасць і сімпатыю. Шчыры аповед Саламеі Пільштыновай таксама правакуе чытача на апраўданне яе неадназначных учынкаў, хітрыкаў і маніпуляцый людзьмі. Больш за тое, праявы яе смеласці, настойлівасці, вынаходлівасці, жыццёвай трываласці выклікаюць захапленне.

У жыцці ў Саламеі няма заступнікаў, яна самотная перад жыццёвымі нягодамі, але пры гэтым валодае велізарнай прабіўной сілай. Шмат разоў яна паўтарае: «Я хоць і бязродная шляхцянка, але буду свайго дамагацца» [1, с. 289]. Яна заўсёды трымае ініцыятыву ў сваіх руках. Для ілюстрацыі прыгадаем некалькі прыкладаў. Калі князь Міхал Радзівіл Рыбанька, да якога яна паступіла на службу, не дае ёй дазволу на падарожжа ў Пецярбург, яна смела яму пярэчыць, што «хоць ты мне і не дасі пашпарта і ліста, аднак я паеду» [Там жа, с. 89]. Пад час падарожжа гаспадыня карчмы дзівіцца яе адвазе, што «маладая белагаловая толькі з двума людзьмі адважылася ехаць у такую далёкую дарогу». У прыдарожных лясах робіць гвалт шайка злодзеяў і забойцаў. Саламея забараняе расказваць пра гэта слугам, каб тыя са страху не разбегліся, і, нягледзячы на перасцярогу, працягвае свой шлях. Толькі інтуіцыя, смеласць і шчаслівы выпадак пазбаўляюць яе ад пагібелі.

Дзякуючы ініцыятыве і вынаходлівасці, яна легка атрымлівае доступ да двара расійскай імператрыцы, хаця іншыя чакаюць аўдыенцыі месяцамі. Хітрасцю яна трапляе ў Вроцлаў, закрыты на каменданцкую гадзіну, бо ідуць ваенныя дзеянні паміж Аўстрыяй і Прусіяй, і хітрасцю здолела яго пакінуць, атрымаўшы пашпарт у самога прускага караля Фрэдэрыка II. Пры сустрэчы з ім, якая адбылася таксама дзякуючы маніпуляцыям, яна заяўляе: «Дазволь мне выехаць з Вроцлава ў Польшчу, калі гэта магчыма, альбо загадай даць мне на мае патрэбы, гэта значыць суфіцыенцыю мне, людзям і коням маім, бо я, бязродная шляхцянка, мала маю на дарогу» [Там жа, с. 204]. Усе купцы дзівіліся, што Саламея атрымала патрэбны дакумент на выезд, а яны па паўгода яго намагаліся і так і не атрымалі. Гераіня выкарыстоўвае людзей, не задумваючыся пра наступствы для іх. Калі трэба тэрмінова перайсці расійскую мяжу – яна пераапранаецца сялянкай, падстаўляючы пры гэтым возчыка-вяскоўца і афіцэра, які іх прапусціў. Пільштынова – добры псіхолаг і дыпламатка, менавіта гэта дапамагае ёй і пры сустрэчы з разбойнікамі падчас падарожжа ў Сафію, і пры расійскім двары.

Не толькі прыроджаная схільнасць да авантур, або адчуванне сіроцтва і «выкінутасці» са звычайнага асяродку змушала Саламею на бясконцыя

вандраванні. Ёй уласціва душэўная энтрапія і ўнутраны разлад, як адбітак і вынік неўладкаванасці і дэструкцыі навакольнай рэчаіснасці. Як і героі пікарэскі, яна не можа спыніцца на дасягнутым, яе цягне на новыя авантуры. Саламея пастаянна разбурае свой асабісты свет, тую прыватную прастору, якую ёй толькі-толькі ўдалося наладзіць. У той жа момант, калі жыццё становіцца стабільным, яна атрымлівае пашану і багацце як умелая лекарка, заслугоўвае ласку і апеку высокіх пацыентаў – ёй становіцца не камфортна. Душэўны неспакой і патрэба адрэналіну ў крыві гоніць яе ў дарогу, толькі так яна адчувае жыццёвы тонус і пераадольвае ўнутраную неўладкаванасць і неспакой. Дарога і авантуры, сама стыхія руху надаюць сэнс яе жыццю. Такім чынам, для «Авантураў», як і для класічнай пікарэскі, вельмі важны хранатоп дарогі, бо часцей з дарогай, падарожжам звязаны бясконцыя прыгоды аўтаркі (пра гэта сведчаць назвы навел «Першае падарожжа ў Стамбул», «Трэцяя авантура ў Стамбуле», «Падарожжа і прыгоды ў Рушчуку», «Авантура ў дарозе на начлезе» і г.д.). Калі ёй выпадае спыніцца і пажыць больш доўгі час у адным месцы, там у мемуарах будуць пераважаць устаўныя навелы, якія распавядаюць пра незвычайныя здарэнні, мясцовыя звычаі, цікавых асоб.

Як падкрэслівае В. В. Кожынаў, пікара адчувае сябе не толькі «выкінутым» з нармальнай плыні жыцця, але і свабодным, не скаваным ніякімі правіламі і ўмоўнасцямі. Ён піша: «Противоречивой основой повествования является как раз то, что трудная и требующая плутовства и преступлений необходимость бороться с миром в одиночку есть одновременно желанная и дающая радость свобода своего, личного бытия, своей собственной истории» [5]. Саламея Пільштынова – самадастатковая асоба з падкрэслена актыўным, дзейсным пачаткам. Не сацыяльныя або гендарныя стэрэатыпы, не традыцыя і нарматыўнасць вызначаюць яе жыццёвую дарогу – яна свабодная ў сваім самавызначэнні і, пераадольваючы перашкоды і асабістыя драмы, сама творыць свой лёс. Пільштынова здзяйсняе не толькі разнастайныя геаграфічныя падарожжы, але і сацыяльныя перамяшчэнні. Пад час авантур ёй даводзіцца кантактаваць з прадстаўнікамі самых розных слаёў грамадства і рухацца ўверх па сацыяльнай лесвіцы: напрыканцы яна становіцца прыдворнай лекаркай султанскага гарэма. Яна здзяйсняе і культурнацывілізацыйнае падарожжа, бо яднае свет хрысціянскі з мусульманскім. У яе мемуарах паўстае сапраўды мультыкультурны свет, шматканфесійны, шматмоўны і шматаблічны.

Твор Саламеі Пільштыновай сугучны агульным тэндэнцыям развіцця еўрапейскага рамана і пацвярджае жыццяздольнасць мастацкіх адкрыццяў пікарэскі ў творах розных нацыянальных літаратур.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Пільштынова, С.* Авантуры майго жыцця : раман / С. Пільштынова ; пер. з пол. мовы М. Хаўстовіча. – Мінск : Маст. літ., 1993. – 381 с.
2. *Мальдзіс, А.* Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя: Нарысы быту і звычаяў / А. Мальдзіс. – Мінск : Маст. літ., 1982. – 256 с.

3. *Липатов, А. В.* Формирование польского романа и европейская литература: Средневековье, Возрождение, Барокко / А. В. Липатов. – М. : Наука, 1977. – 300 с.
4. *Пискунова, С. И.* Плутовской роман [Электронны ресурс] / С. И. Пискунова. – Режим доступа: http://svr-lit.ru/svr-lit/articles/piskunova-plutovskoj-roman.htm. – Дата доступа: 15.03. 2019.
5. *Кожинов, В. В.* Происхождение романа [Электронный ресурс] / В. В. Кожинов. – Режим доступа: http://svr-lit.ru/svr-lit/kozhinov-proishozhdenie-romana/index.htm. – Дата доступа: 15.03. 2019.